ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 17 (973) | АЎТОРАК, 14 снежня 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА РЭСПУБЛІКАНСКІМ СЕМІНАРЫ-ПРАКТЫКУМЕ

У апошняй дэкадзе лістапада Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь правяло на базе Мазырскага дзяржаўнага педінстытута імя Н.К.Крупскай, мазырскіх політэхнічнага тэхнікума і ПТВ №228 хімікаў рэспубліканскі семінар-практыкум "Фарміраванне выхаваўчага сацыяльна-культурнага асяроддзя ў інтэрнатах навучальных устаноў. Ад нашага універсітэта ў ім прынялі ўдзел рэктар член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў і прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце дацэнт М.М.Воінаў.

Па вызначанай праграме навукоўцы і практычныя работнікі заслухалі і абмеркавалі шэраг дакладаў і паведамленняў актуальнай тэматыкі. Асаблівую цікавасць выклікала выступленне міністра адукацыі Беларусі В.І.Стражава.

Удзельнікі семінара-практыкума азнаёміліся з матэрыяльна-тэхнічнай базай педінстытута, політэхнікума і прафтэхвучылішча, з практыкай дзейнасці цэнтра сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі і студэнцкага санаторыя-прафілакторыя.

## ДАГАВОР ПАДПІСАНЫ

**8-га снежня ў Маскве адбылося падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Пад гэтым гістарычным дакументам свае подпісы паставілі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Б.М.Ельцын.**

**Падпісанне двухбаковага Дагавора пасля яго парламенцкай ратыфікацыі будзе мець велізарнае сацыяльна-эканамічнае і палітычнае значэнне. Таму пераважная большасць беларусаў і расіян аднесліся да яго з адабрэннем і ўсім зразумелай прыхільнасцю.**



## ПРА МАГУТНЫ ТАЛЕНТ ЮБІЛЯРА

Споўнілася сто гадоў з дня нараджэння выдатнага празаіка, дзіцячага пісьменніка, крытыка, літаратуразнаўцы і грамадскага дзеяча Міхася Лынькова. З гэтай нагоды ў памяць аб ім Нацыянальная акадэмія навук Беларусі правяла навуковую канферэнцыю. Яе адкрыў і вёў наш зямляк доктар філалагічных навук, намеснік дырэктара акадэмічнага Інстытута літаратуры імя Я.Купалы С.С.Лаўшук.

Удзельнікаў канферэнцыі цёпла вітаў прэзідэнт НАНБ А.П.Вайтовіч.

На пленарным пасяджэнні з дакладамі аб жыццёвым і творчым шляху Міхася Лынькова, асаблівасцях яго шматграннай літаратурнай і грамадскай дзейнасці выступілі доктар філалагічных навук, прафесар Белдзяржуніверсітэта Д.Я.Бугаёў, акадэмікі В.А.Каваленка і І.Я.Навуменка.

Шмат цікавага і запамінальнага расказаў пра чалавека магутнага таленту сын Якуба Коласа М.К.Міцкевіч.

Пасля пленарнага пасяджэння работа канферэнцыі працягвалася ў дзвюх секцыях. Па адной з іх з навуковым паведамленнем выступіў прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце нашага універсітэта М.М.Воінаў.

Адной з адметнасцей шырокамаштабнага літаратурнага мерапрыемства з"явілася тое, што ў ім прынялі ўдзел сын і ўнучка Міхася Лынькова — доктар тэхнічных навук Л.М.Лынькоў і Ірына Ратнікава.

Б.ВАЛОДЗІН.

## НАДЫШЛА ПАРА ПРАВЕРЫЦЬ ВЕДЫ

Непрыкметна бяжыць час. Да фінішу набліжаецца 1999 год. У гэты перыяд для студэнтаў пачынаюцца, як кажуць, гарачыя дзянёчкі. На парозе — зімовая залікова-экзаменацыйная сесія. Яна падвядзе вынікі працы выкладчыкаў і іх выхаванцаў за першую палову бягучага навучальнага года. Таму цяпер трэба даражыць кожнай мінутай, мэтанакіравана сканцэнтраваць усе свае разумовыя і фізічныя намаганні. Гэта асабліва важна для першакурснікаў. Набыццё абранай спецыяльнасці для іх — толькі пачатак. Але ў многім ён можа адбіцца на будучых адзнаках.

Спачатку будуць залікі. І да іх нельга адносіцца як да нечага другараднага. Дапушчаныя тут збоі могуць істотна парушыць рытм пры здачы экзаменаў.

Даўно вядома, што разлікі на лёгкія пытанні, "шчаслівыя білеты" апраўдваюцца даволі рэдка. Поспех і на заліках, і на экзаменах забяспечваюць толькі глыбокія і грунтоўныя веды. Таму не трэба дарэмна траціць час, а з поўнай аддачай выкарыстоўваць яго для дасканалага засваення кожнай вывучаемай дысцыпліны. Тады не будзе бяссоных начэй, трывогі і разгубленасці перад кожным выпрабаваннем на студэнцкую годнасць.

## АБ АДУКАЦЫІ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ

**Беларуская сталіца — горад Мінск стаў месцам сустрэчы замежных выпускнікоў, студэнтаў, аспірантаў і стажораў вышэйшых навучальных устаноў нашай краіны. У яе вну атрымалі адукацыю многія тысячы юнакоў і дзяўчат з розных дружалюбных дзяржаў. Асабліва прэстыжнымі сталі для іх тэхнічныя, медыцынскія, эканамічныя і некаторыя іншыя спецыяльнасці.**

Ад нашага універсітэта ў сустрэчы на чале з прарэктарам па вучэбнай і выхаваўчай рабоце дацэнтам М.М.Воінавым удзельнічалі пяцікурснікі Цун Хуншэй з філалагічнага, Ван Сяоюй і Сюн Лі з эканамічнага факультэтаў. Яны сталі сведкамі зацікаўленай і грунтоўнай размовы аб праблемах навучання замежных студэнтаў у Рэспубліцы Беларусь. У час яе сваімі меркаваннямі падзяліўся міністр адукацыі В.І.Стражаў.



**Адказны і хвалюючы этап ў жыцці пяцікурснікаў — педагагічная практыка. Даць вучням патрэбныя веды па пэўнай дысцыпліне, зацікавіць іх ёй не так ужо і лёгка, як падаецца на першы погляд. Неабходны максімум стараннасці, глыбіня ўласных ведаў.**

**Студэнту гр.Б-51 біялагічнага факультэта Сяргею Нікановічу давялося праходзіць педпрактыку ў абласным ліцэі, куды трапляюць вучыцца самыя здольныя школьнікі з ўсёй Гомельшчыны. Таму, зразумела, у практыканта адказнасць за якасць праведзеных урокаў была двайная. Сваімі каштоўным парадамі дапамагаў яму метадыст ліцэя П.У.Власаў (на здымку).**

Фота У.ЧЫСЦІКА.

## АКТЫВІСТЫ МІЛАСЭРНАСЦІ

У гутарцы з нашым карэспандэнтам член прэзідыума абласнога аддзялення Беларускага дзіцягача фонду, рэдактар аддзела адукацыі, навукі і культуры газеты "Гомельская праўда" А.Клыга паведаміла, што на працягу апошняга часу адбыліся чатыры акцыі міласэрнасці: "Не без добрых душ на свеце", "Свята сярод будняў", "Сэрца аддаю дзецям", "З любоўю да дзяцей". Іх мэта — аказанне матэрыяльнай і маральнай дапамогі дзецям-сіротам і інвалідам, дзецям са шматдзетных сем"яў і тым, хто выхоўваецца ў Гомельскім доме дзіцяці і ў Чачэрскім дзіцячым доме сямейнага тыпу.

Актыўнымі арганізатарамі ўсіх гэтый акцый, падкрэсліла журналістка, былі члены таварыства "Сябра дзяцей", студэнты нашага універсітэта на чале з дацэнтам Т.П.Гаранінай. Яны збіралі для абяздоленых рабят розныя рэчы, рыхтавалі для іх уласнымі рукамі разнастайныя прыгожыя і цікавыя вырабы, набывалі сувеніры і г.д. А пры сустрэчах, акрамя ўсяго гэтага, дарылі і сваю пяшчоту, сардэчнае цяпло, прывозілі цацкі, ласункі.

Шмат клопатаў у членаў таварыства "Сябра дзяцей" зараз. Яны заклапочаны тым, каб прынесці найбольшую радасць сваім падапечным напярэдадні новага 2000 года.

## НАВУКОВЫЯ ПРАЦЫ НЕ ЗАЛЕЖАЦЦА

**Атрымана ліцэнзія Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку на выданне "Известий Гомельского государственного университета им.Ф.Скорины". Матэрыялы ў ім будуць змяшчацца на дзвюх мовах — беларускай і рускай. Асобнымі часопісамі на ўласнай паліграфічнай базе пачнуць друкавацца навуковыя працы па беларускай мове, беларускай літаратуры, пытаннях матэматыкі. Ва універсітэцкім выданні прадугледжана месца і на публікацыю матэрыялаў па іншых раздзелах сучаснай навукі.**

## ШЧАСЦЕ ЖЫЦЬ!

Пад такой назвай Асацыяцыя сем'яў дзяцей-інвалідаў з цэрэбральным паралічом і спіннамазгавымі паталогіямі, наш універсітэт, аб'яднанне "Грамадзянскія ініцыятывы" правялі ў выставачнай зале выстаўку малюнкаў і мастацкіх работ дзяцей з фізічнымі і сенсорнымі парушэннямі.

...Свет многіх з іх абмяжоўваецца ў асноўным рамкамі кватэры. Але ў творчых работах гэтых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія могуць назіраць за жыццём толькі з акна дома ці па тэлебачанні, яно прадстаўлена ва ўсёй паўнаце — ад партрэтаў сваіх родных, блізкіх, знаёмых , прыгажосці прыроды ва ўсе часы года да бязмежнай прасторы Сусвету. Рознажанравая творчасць дзяцей-інвалідаў уражвае, здзіўляе, захапляе — і сваёй даступнай прастатой і філасофскай заглыбленасцю.

Былі на выстаўцы работы, выкананыя на дастаткова прафесійным узроўні, як напрыклад, у 16-гадовага Андрэя Лапіцкага, які закончыў мастацкае вучылішча, не менш цікавыя і значныя яны і ў іншых рабят —Дзімы Кароткага, Тані Вакарынай, Марыны Сініла, Дзімы Юшчанкі.

—Мы прадставілі ў экспазіцыі больш 200 работ , аўтарамі якіх з'яўляюцца 14 хлопчыкаў і дзяўчынак, — расказвае старшыня Асацыяцыі сем'яў дзяцей-інвалідаў Яўгенія Маставая. — Мэта выстаўкі —дапамагчы кожнаму хвораму дзіцяці знайсці сваё месца ў жыцці, адчуць сябе паўнапраўным членам грамадства. Наша асацыяцыя, створаная ў 1992 годзе , аб'ядноўвае ў сваіх радах звыш 300 сем'яў, у якіх выхоўваюцца хворыя дзеці . Мы разумеем, што сёння вельмі важна падтрымліваць іх не толькі матэрыяльна— арганізоўваць лячэнне і аздараўленне , размяркоўваць гуманітарную дапамогу, але і клапаціцца пра духоўны стан . Таму такія выстаўкі творчасці плануем наладжваць пастаянна.

"У кожнай з работ — частка вашай душы, душы прыгожай, чыстай і творчай" — гэта радкі з кнігі водгукаў наведвальнікаў выстаўкі. Больш дакладна, бадай, і не скажаш.

Т.ДУБЯК.

*Нашы юбіляры*

## РУЛЯВОЕ ВЯСЛО Ў НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

**Гэтыя снежаньскія дні спаўняецца 60 гадоў старшаму выкладчыку кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, заслужанаму трэнеру Рэспублікі Беларусь, майстру спорту СССР Уладзіміру Кузьмічу Паўлючкову.**

...Як і многіх яго аднагодкаў, дзіцячыя і юнацкія гады Уладзіміра праходзілі на рацэ Сож, дзе ён рана навучыўся плаваць, а яшчэ раней — весламі на лодцы. У тыя далёкія гады разыгрывалася першынство БССР і СССР па народнаму, як было прынята назваць, веславанню. У 1953 г. яго грудзі ўпрыгожыў залаты медаль пераможцы першынства рэспублікі (у двойцы) на народнаму веславанню.

У красавіку 1954 г. у Гомель упершыню прывезлі лодку-каноэ, якая адразу прывабіла Уладзіміра, і ён хутка яе асвоіў.

На наступны год Уладзімір выйграе першынство БССР на каноэ-адзіночцы сярод юнакоў. У 1956 г. у г.Рызе прахадзіла першынство СССР па веславанню на байдарках і



каноэ сярод юнакоў, дзе У.Паўлючкоў у пары з Анатоліем Маркоўскім заваёўваюць залатыя медалі.

З 1957 па 1961 гг. Уладзімір вучыцца ў Гомельскім педінстытуце імя В.П.Чкалава на факультэце фізічнага выхавання. У 1958 г. ён заваёўвае сярэбраную ўзнагароду на маладзёжным першынстве СССР у г.Саратаве. Праз год у Маскве беларускі вясляр выступае на Спартакіядзе народаў СССР і ўпершыню выконвае нарматыў "Майстар спорту СССР". Яго ўключаюць кандыдатам у зборную каманду краіны, ідзе падрыхтоўка да Алімпійскіх гульняў у Рыме, але на іх трапляюць Леанід Гейштар і Сяргей Макаранка — будучыя алімпійскія чэмпіёны.

У 1961 годзе Уладзімір Паўлючкоў заваяваў сярэбраную ўзнагароду на чэмпіянаце СССР у г.Цярнопалі на дыстанцыі 500 м , а на наступны год становіцца чэмпіёнам ЦС ДСТ "Спартак". Ён жа — бронзавы прызёр міжнароднай рэгаты у г.Пскове.У 1963 г.вясляр прымае ўдзел у Спартакіядзе народаў СССР у Маскве, дзе займае чацвёртае месца, а на наступны год на яго грудзях — сярэбраны медаль міжведамаснага першынства СССР у эстафеце 4х500м.

З 1965 года пачынаецца трэнерская біяграфія Уладзіміра Кузьміча. З таго часу і па сённяшні дзень ён працуе ў нашай навучальнай установе. За ўсе гэтыя гады ім падрыхтавана чатыры майстры спорту міжнароднага класа і больш 30 майстроў - спорту СССР і Рэспублікі Беларусь.- Сярод яго выхаванцаў -- чэмпіён СССР Віталь Гусеў, прызёры чэмпіянатаў СССР , майстры спорту міжнароднага класа Віктар Харытонаў і Міхаіл Гольцаў, пераможцы Кубка СССР і прызёры чэмпіянату СССР Анатоль Суслаў, Кацярына Кукса, Анатоль Саўчанка і інш.

Студэнцкія каманды нашай навучальнай установы — неаднаразовыя пераможцы Спартакіяды вну Беларусі па веславанню на байдарках і каноэ, пераможцы Усесаюзных студэнцкіх гульняў (Кіеў,1979 г.), сярэбраныя прызёры —Гомель-1981, Хмяльніцкі -1983 г.

Уладзімір Кузьміч з гонарам успамінае сваіх вучняў: Віктара Парфянцова — дырэктара Рэспубліканскай школы вышэйшага спартыўнага майстэрства, Міхаіла Гольцава і Валерыя Шэўчыка — дырэктараў Гомельскіх СДЮСШАР прафсаюзаў і адукацыі, Сяргея Сямёнава — загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту ГДТУ імя П.Сухога, кандыдата педагагічных навук, дацэнта.

Каля дзесяці выхаванцаў У.К. Паўлючкова ( што вельмі рэдка) носяць высокае званне заслужанага трэнера СССР і Рэспублікі Беларусь. Сярод іх - -заслужаныя трэнеры СССР Барыс Бірукоў (г.Бабруйск) і Мікалай Гаўрыленка з г.Рагачова (які, на жаль, рана пайшоў з жыцця), заслужаныя трэнеры Рэспублікі Беларусь— Уладзімір Шантаровіч (г.Мазыр), Генадзь Шышоў (г.Рагачоў), Мікалай Банько (г.Бабруйск), Кацярына Кукса (г.Гомель) і інш.

За падрыхтоўку спартсменаў высокага класа Уладзіміру Кузьмічу было прысвоена высокае званне "Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь". Ён узнагароджаны Ганаровай граматай Гомельскага аблвыканкома, медалём "За спартыўную доблесць", граматамі ЦС "Буравеснік", Рэспубліканскага, абласнога і гарадскога спорткамітэтаў.

У сакавіку бягучага года Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь узнагародзіла У.К.Паўлючкова Ганаровым знакам "За развіццё фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь" — вышэйшай узнагародай міністэрства.

Верыцца, што выхаванцы юбіляра яшчэ доўга будуць радаваць нас новымі высокімі спартыўнымі дасягненнямі.

**В.МАРЧАНКА.**

*ПАЕЗДКІ, УРАЖАННІ*

## НОВЫЯ СУСТРЭЧЫ З КУПАЛАМ

Пясняр і Мастак... Нацыянальны прарок... Сапраўдны паэт... Уладар дум і імкненняў беларускага народа... І проста шчыры і добры чалавек, сапраўды інтэлігент і рамантык, чый лёс склаўся вельмі трагічна, і загадка смерці якога нават на сённяшні дзень яшчэ да канца не раскрыта... Гэта ўсё ён, Іван Дамінікавіч Луцэвіч, Янка Купала... Такі знаёмы і ў той жа час такі невядомы нам...

Бо, часам нават мы, студэнты-філолагі, даведваемся пра жыццё і творчасць пісьменніка толькі з афіцыйных жыццяпісаў, змешчаных у падручніках і манаграфіях, якія ўключаюць у сябе пералік фактаў, даты, назвы твораў, асаблівасці іх значэння для беларускай літаратуры і ў лепшым выпадку — асобныя фотаздымкі і замалёўкі. Таму, на жаль, многія стваральнікі нацыянальнага прыгожага пісьменства і застаюцца для нас толькі аўтарамі пэўных твораў і практычна не ўспрымаюцца як асобы, як звычайныя людзі.

Менавіта таму з мэтай бліжэйшага знаёмства з жыццёвымі вытокамі, больш дасканалага вывучэння і разумення творчай біяграфіі пісьменніка была арганізавана паездка студэнтаў 4-га курса філалагічнага факультэта пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры беларускай літаратуры У.П.Каваленкі на малую радзіму Янкі Купалы.

І вось ужо мінскі цягнік на Маладзечна вязе нас у Вязынку, у родную вёску, дзе калісьці нарадзіўся будучы паэт. З самых першых хвілін гэты куточак уражвае нейкай асаблівай, незвычайна чыстай і спакойнай уласнабеларускай прыгажосцю. І немалады ўжо яблыневы сад, і люстраная гладзь павольнай і нетаропкай ракі Вязынкі, і дрэвы, што схіліліся над ёй, — уся гэтая зямля, якую калісьці арандавалі Луцэвічы, прываблівае і зачароўвае, пакідаючы на душы вельмі светлае, незабыўнае ўражанне, лёгкую радасць і замілаванне. І тут жа, недалёка ад берага, знаходзіцца хата Купалы, адна частка якой па сваім абсталяванні нагадвае пакой, дзе раней жыла сям'я і ў якой нарадзіўся будучы паэт, другая ж палова — літаратурны музей. Такім чынам, мы не толькі ўбачылі тыя ўмовы, асаблівасці побыту сялян, характэрныя для канца мінулага стагоддзя, калі з'явіўся на свет Купала, але і пазнаёміліся з рададам пісьменніка, бацькамі, сябрамі і настаўнікамі, першымі літаратурнымі спробамі.

І, гледзячы ў акно цягніка, з нейкай заспакоенасцю і сумам пакідалі мы Вязынку.

Пасля выртання ў Мінск мы адразу накіраваліся ў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, дзе з дапамогай падрыхтаванага экскурсавода перад намі паўстаў жыццёвы і творчы шлях народнага песняра. Мы бачылі рукапісы паэта, якія сведчылі аб тым, з якой напружанасцю і старраннасцю ішла праца над кожным словам, як паступова, пасля шматлікіх выпраўленняў нарэшце з'яўляліся такія вядомыя нам сёння радкі. Захаваліся ў музеі і дакументы Купалы, сярод якіх сумна вядомы ліст — пакаянне паэта і пасведчанне аб атрыманні ордэна Леніна. Усё тут гаворыць пра Купалу, нагадвае аб ім... Рэчы, успаміны, фотаздымкі... Нават вопратка, мэбля з былога кабінета, той мяшочак з роднай зямлёй, які ён, ад'язджаючы ў пачатку вайны з Беларусі, узяў з сабой на чужыну.

Шмат цікавага пачулі мы і пра сяброў і знаёмых, жонку пісьменніка, яго сустрэчы і адносіны з другім волатам беларускай літаратуры — Якубам Коласам.

І паступова ў нашым уяўленні канчаткова сфарміраваўся вобраз таленавітага паэта, класіка нацыянальнага прыгожага пісьменства, а таксама цікавага і самабытнага чалавека, сціплага і шчодрага, памяркоўнага і няўрымслівага, сапраўднага інтэлігента і рамантыка, аднаго з пачынальнікаў нашай новай культуры пачатку XX стагоддзя.

Каб развітацца з Купалам, завіталі мы і на Даўгаброддскія могілкі, дзе ён пахаваны...

І вось ужо цягнік вяртае нас у Гомель. А перад вачамі адно за адным, нібы каляровыя малюнкі, праходзяць нядаўнія ўражанні, яркія і запамінальныя, што прынеслі нам новыя сустрэчы з Купалам...

**Святлана КАГАН, студэнтка гр.БА-43 філалагічнага факультэта.**

*Памятныя знаёмствы*

## ДА СТУДЭНТАЎ ЗАВІТАЎ ПІСЬМЕННІК...

На філфаку — падзея! Да нас у госці завітаў вядомы беларускі пісьменнік, наш знакаміты зямляк Васіль Ткачоў. На сустрэчу сабраліся студэнты-"беларусы" першага і пятага курсаў.

На працягу гадзіны мы з захапленнем слухалі гумарэскі і фельетоны, новыя апавяданні і накіды, артыкулы і нататкі. Пісьменнік з цікавасцю выслухаў і з гумарам адказаў на ўсе пытанні студэнтаў. Васіль Ткачоў таксама расказваў пра сваю плённую працу драматурга. Слухачоў захапілі невялікія гісторыі з жыцця пісьменніка і расказы пра цікавыя выпадкі, якія адбыліся з ім у час супрацоўніцтва з Гомельскім абласным драматычным тэатрам.

А таму жадаючых набыць новыя кнігі пісьменніка было шмат, тым больш, што да іх дадаваўся яшчэ і аўтограф на памяць.

Гэтая сустрэча закранула нашы сэрцы, унесла прыемнае ажыўленне ў будзённае студэнцкае жыццё. Васіль Ткачоў паабяцаў завітаць у хуткім часе да нас яшчэ раз. Мы з нецярплівасцю будзем чакаць гэтай сустрэчы.

**Ірына ЛАРЫЁНАВА, студэнтка гр. Б-12 філалагічнага факультэта.**

*З міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі*



## ЧЫСТАЯ ЭКАЛОГІЯ – КРЫНІЦА ЖЫЦЦЯ

У апошнія гады вялікая ўвага ўдзяляецца праблемам экалогіі як прыродных ландшафтаў, так і трансфармаваных у выніку дзейнасці чалавека. Трансфармацыя ландшафтаў Палесся суправаджаецца шэрагам негатыўных працэсаў: забруджваецца ўсе асноўныя асяроддзі жыццядзейнасці чалавека, змяняецца флора і фаўна. Прадстаўнікі дзікай фаўны, якія асвойваюць зменены ландшафт, дасягаюць у ім максімальнай колькасці і садзейнічаюць тым самым пераносу ў горад узбуджальнікаў некаторых прыроднаачаговых захворванняў.

Гэтымі і іншымі прычынамі была прадыктавана неабходнасць правядзення І Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Экалагічныя праблемы Палесся і сумежных тэрыторый". Для правядзення канферэнцыі г.Гомель выбраны не выпадкова, таму што для нашага рэгіёна самымі актуальнымі праблемамі сёння з'яўляюцца экалагічныя. Гэта звязана не толькі з правядзеннем шырокамаштабнай меліярацыі, хімічнымі атруваннямі, але і забруджваннем тэрыторыі Гомельшчыны радыеактыўнымі элементамі ў выніку катастрофы на ЧАЭС. Канферэнцыя праходзіла на працягу трох дзён. У яе рабоце прынялі ўдзел вучоныя і спецыялісты 29 навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў Беларусі і Расіі. Усяго на канферэнцыю было заяўлена 127 навуковых дакладаў, якія прадстаўлялі вынікі даследаванняў вучоных дзвюх краін. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел усе асноўныя арганізацыі, якія займаюцца вывучэннем экалагічных праблем Палесся і сумежных тэрыторый: Белдзяржуніверсітэт, Інстытут лесу НАНБ, Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія, Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.Куляшова, Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.Машэрава, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы, ГДУ імя Ф.Скарыны, Міжнародны універсітэт радыеэкалогіі імя А.Д.Сахарава, Інстытут заалогіі НАНБ, Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт, Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Н.К.Крупскай, РНТЦ "Экомир" НАНБ, Сібірскі медінстытут, Ліпецкі дзяржаўны педагагічны інстытут, Інстытут эвалюцыі і экалогіі імя А.М.Северцава (Расія) і інш.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел звыш 70 чалавек, з іх 9 дактароў і 25 кандыдатаў навук.

Працавалі секцыі: "Экалогія жывёлін", "Экалогія раслін", "Ландшафтная экалогія", "Праблемы аховы навакольнага асяроддзя", "Медыка-экалагічныя і радыеэкалагічныя праблемы".

На пленарным пасяджэнні з дакладамі выступілі І.М.Булавік, д.с.-г.н. з Інстытута лесу НАНБ, У.І.Міхалусеў, к.б.н., загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды ГДУ, Я.П.Крэмлеў, прафесар, загадчык кафедры экалогіі ГрДУ імя Я.Купалы, Б.П.Савіцкі, прафесар Інстытута заалогіі НАНБ, аўтар гэтых радкоў.

З асаблівай вастрынёй на канферэнцыі прагучала заклапочанасць аб стане ўнікальных палескіх комплексаў. Былі не толькі глыбока прааналізаваны механізмы трансфармацыі ландшафтаў у выніку дзейнасці чалавека, але і прапанаваліся метады іх вывучэння.

У час работы канферэнцыі адбылася таксама цікавая сустрэча са студэнтамі-экалагамі нашага універсітэта і пасяджэнне "круглага стала" "Палессе — беларуская Венецыя".

**А.КУСЯНКОЎ, загадчык кафедры экалогіі, кандыдат біялагічных навук, дацэнт.**

*На тему, волнующую молодых*

# В ПОИСКАХ ОТВЕТА

**К**акое чудо! Вновь получила от подруги письмо! И в нем опять — SOS: с парнем, видишь ли, поругалась. Любовь потеряна! Что делать? Время бежит, а возраст "старой девы" в наше время все моложе.

Ох, уж эта любовь! Уже и XXI век на пороге, все проходит, все изменяется — любовь остается. Сколько людей искусства отдали дань этой капризной кокетке. Да что великие? Простые смертные все ищут, ищут эту Любовь — волнуются; находят — снова сердечные переживания; а уж — не дай Бог! — теряют — тут прямо жизненная драма получается.

Ох, уж эта Любовь! Всюду она, прекрасная. Года идут, а любовь остается... Вернее, слово остается и смысл его тоже. А вот форму Любви каждое поколение свою предлагает. Удивляюсь людям старшего возраста. Смотрят старые фильмы, где парень боится подойти к девушке, и восхищаются: "Вот это настоящее чувство, не то, что у теперешней молодежи". Ну что тут скажешь? Ан-нет, подождите, а кто зачитывается современными пошлыми "бульварными" романами? — мамы; кто до сумасшествия смотрит мыльные оперы и при этом утверждает, что в них много поучительного? — бабушки. Да и мужчины не отстают.

Порой оглянешься вокруг: ну где же ты, Любовь? Я имею ввиду не только любовь двоих, но и любовь к Родине, матери, детям... Да, знаем-то мы много понятий этого чувства, а вот умеем ли любить? Конечно, говорите, умеем. Просто время сейчас тяжелое, денег нет, настроения тоже. Телевизор включишь: войны, убийства, кровь, разруха; газету развернешь, гороскоп прочитаешь — и жить не хочется. Политики раздражают, коллеги на работе — тоже, в семье — ссоры... В магазине фраза "все люди — братья" почему-то приходит на ум, когда тебя "любезно" обслуживает продавец или "бережно" выводят из очереди.

Товарищи! Любовь теряем! Забыли-то мы о ней, не ценим, не замечаем, мимо проходим.

Ах, простите, как это я забыла о гражданах, которые, несмотря ни на что, усердно любят. У них даже и название этому "трудовому процессу" имеется, как-то: "заниматься любовью". Но, дорогие мои, это оксюморон получается (филологи меня поймут). Заниматься можно математикой, физикой, гимнастикой. А любовь чувствовать надо!

Не спорю, у наших людей спектр чувств богатый, но ведь часто — это зависть, раздражительность, желание унизить близкого, озлобленность. Где уж тут место для Любви?

Дети в семьях не видят ласки (главное, чтобы сытые и одетые были); большинство мужчин не обращают внимание на тех, кто с ними и в горе, и в радости (зарплату носят — чего еще надо?); молодые люди теперь заботятся о своем здоровье в любви (а как же: невнимательные "занятия любовью" — риск для жизни).

Все, не знаю, что ответить подруге. Получается нет ее, любви этой? Или есть? А где доказательства? Осталась последняя надежда — родители (все-таки 26 лет вместе).

— Папа, ну хоть ты скажи мне: есть любовь на свете?

Улыбаются с мамой. И вот, наконец, после небольшой паузы я слышу мужской, прямо-таки солдатский ответ:

— Есть.

Вот и все... И доказательств больше никаких искать не надо. Так о чем я здесь еще рассуждаю? Пойду сейчас же писать ответ подруге.

Знаю, что теперь это будет несложно.

**Татьяна ЦЕЛЕХОВИЧ,**
**студентка гр.РБ-23**
**филологического факультета.**

# ФЕСТЫВАЛЬ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ

**У** мінулым годзе ў краіне адзначалася 35-годдзе студэнцкага будаўнічага руху, і ўсё тое лепшае , што было ў ім напрацавана за гэты час, сёння знаходзіць свой працяг. Праўда, маштабы ўжо не тыя з-за эканамічных цяжкасцей у рэспубліцы, але ўсё ж... Тысячы маладых людзей знаходзяць прымяненне сваім сілам на розных аб'ектах — у сельскай гаспадарцы, на прамысловасці, у сферы педагагічнага выхавання і інш.

Вынікі працоўнага семестра-99 былі падведзены нядаўна на абласным фестывалі студэнцкіх атрадаў, які праходзіў у актавай зале нашага універсітэта. Яго арганізатарамі з'яўляліся камітэт па справах моладзі Гомельскага аблвыканкома, абком Беларускага патрыятычнага саюза моладзі, БСМ і абласное аддзяленне Рэспубліканскай асацыяцыі міжнародных маладзёжных абменаў і турызму. У фестывалі прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў горада і вобласці, якія былі задзейнічаны ў летняй працы. Каля 2 тысяч студэнтаў , навучэнцаў і нават школьнікаў былі заняты карыснай справай - - у складзе атрадаў самага рознага накірунку: ад валанцёрскіх экалагічных (без усялякай грашовай аплаты) да сельскагаспадарчых і педагагічных працавалі не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Самыя буйныя па колькасці байцоў зводныя атрады выязджалі ў Краснадарскі і Стаўрапольскі край на ўборку фруктаў і гародніны — іх прымалі ў аграфірме "Сад-гігант" і адкрытым акцыянерным таварыстве "Каўказ" пасёлка Ізабільны. Актыўнымі ўдзельнікамі гэтых атрадаў былі студэнты розных факультэтаў ГДУ.

Лепшыя камандзіры, камісары, байцы атрымалі на фестывалі заслужаныя ўзнагароды: ганаровыя граматы абласнога камітэта па справах моладзі, БСМ і БПСМ, каштоўныя падарункі, сувеніры. Група ўдзельнікаў будатрадаўскага руху ўдастоена таксама Ганаровых грамат ЦК БПСМ.

Вызначаны і лепшыя атрады, якія таксама без ўзнагарод не засталіся.

Цікавая канцэртная праграма, якую падрыхтавалі для ўдзельнікаў фестывалю самадзейныя артысты культурнага цэнтра ГДУ, стварала ўсім прысутным у зале выдатны настрой.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

**Это интересно**

# 10 ГЕНИЕВ УХОДЯЩЕГО ТЫСЯЧЕЛЕТИЯ

**Б**ританская корпорация Би-Би-Си организовала голосование в Интернете по определению 10-ти самых выдающихся мыслителей уходящего тысячелетия. Вот итоговый результат голосования:

1. **Карл Маркс** (1818-1883);
2. **Альберт Эйнштейн** (1879-1955);
3. **Исаак Ньютон** (1642-1727);
4. **Чарльз Дарвин**(1809-1882);
5. **Фома Аквинский** (1225-1274);
6. **Стефан Хоскинг** (британский, ныне живущий, астрофизик, автор научного бестселлера "Краткая история времени");
7. **Иммануил Кант** (1724-1804);
8. **Рене Декарт** (1596-1650);
9. **Джеймс Максвелл** (1831-1879);
10. **Фридрих Ницше** (1844-1900).

Организаторы опроса никак не ожидали победы автора "Манифеста Коммунистической партии" и "Капитала" и предлагали свою "горячую десятку", которую возглавлял религиозный философ Фома Аквинский.

*Будущим абитуриентам для размышления*

**Абитуриентская кампания случается каждый год. Казалось бы, что нового можно сказать, анализируя ее итоги? И все же всегда есть информация, которая может пригодиться выпускникам школы будущего года и, с другой стороны, послужить уроком для организаторов этой своеобразной ярмарки знаний и талантов.**

# ЧТОБЫ УЧЕБА В ВУЗЕ НИЧЕГО НЕ СТОИЛА,
## НУЖНЫ СТОЯЩИЕ ЗНАНИЯ

**Л**ето 1999 года сохранило тенденцию предыдущих лет к росту числа семнадцатилетних "птенцов", покидающих школьное "гнездо". Поэтому и заявлений в белорусские государственные вузы ими было подано на полтысячи больше, чем в 1998 году. И все же самый бурный всплеск этого показателя мы уже пережили именно в прошлом году, когда желающих поступить в вузы было на 13 тысяч (!) больше, чем в предыдущую абитуриентскую кампанию.

Между прочим, столь жесткая конкуренция в борьбе за бюджетное студенческое место вынуждает молодых людей все серьезней относиться к своей подготовке. Если в прошлом году "двойки" на вступительных экзаменах получили 32 тысячи (35,2%) абитуриентов, то в этом году — уже "только" 20,5 тысячи (22,3%). Количество "двоек" по белорусскому диктанту уменьшилось с 26 до 14 процентов, а число "пятерок" увеличилось с 6 до 9 процентов (что весьма отрадно). Две трети абитуриентов-99 написали белорусский диктант на "4" и "5". Столько же получили хорошие и отличные оценки по иностранному языку и историческим дисциплинам. К сожалению, познания в области математики, химии, русского языка и литературы продолжают "хромать".

Пр-прежнему наиболее популярными среди молодежи являются специальности, связанные с культурой, искусством, экономикой и юриспруденцией. В числе самых престижных вузов — неизменно БГУ, экономический и лингвистический университеты, университет культуры. На отдельные факультеты в БГУ и БГЭУ медалистами было подано столько заявлений, что уже только они составляли конкурс более двух человек на место!

В отличие от прошлого года на этот раз уже в технических вузах были специальности, где количество заявлений от медалистов превышало число плановых мест. Пошла в гору популярность таких специальностей, как "Физико-химические методы и приборы контроля качества продукции", "Биотехнология", "Издательское дело", "Метрология, стандартизация и сертификация", "Автоматизированные системы обработки информации" и т.д.

Кстати, набившая оскомину проблема "тиражирования" школами (особенно сельскими) медалистов до сих пор так и не урегулирована. Поэтому по-прежнему имеем то, что имеем: сорок процентов медалистов не прошли в вузы по конкурсу, а около 17 процентов этих "золотых" абитуриентов и вовсе получили двойки на экзаменах.

Выпускники сельских школ на те специальности, по которым не велся целевой контрактный набор, поступали по отдельному конкурсу. Эта практика в целом себя оправдала. Хотя, говорят, случались и казусы — когда проходной балл для сельчан оказывался выше, чем по общему конкурсу. Но все же это — редкие исключения. Подготовка сельских абитуриентов все-таки заметно уступает эрудированности городских лицеистов и гимназистов. В Министерстве образования подумывают, например, о том, чтобы экзамен по информатике для сельской молодежи заменить на экзамен по физике — "по причине ограниченных технических условий сельских школ". Увы.

Пока итоги абитуриентской гонки-99 таковы: на дневные отделения государственных вузов на бюджетное обучение зачислено без малого 24 тысячи студентов, из них 4040 — выпускников сельских школ и 5240 человек — по целевому контрактному набору, среди которых, надо полагать, также основная масса сельчан.

Целевой контрактный набор по-прежнему остается палочкой-выручалочкой при решении кадровых проблем в чернобыльской зоне. Но так уж, видно, мы устроены — ни в каком деле не можем обойтись без "химии": было немало случаев, когда льготы контрактников становились предметом для злоупотреблений. Чего греха таить, на места по целевому набору поступали не самые сильные абитуриенты, и "двойки" на экзаменах у них не были редкостью. Вот здесь и вышло наружу то, что было шито белыми нитками: когда с учетом свободных целевых мест стали предлагать заключение контракта ребятам, которые не прошли по общему конкурсу, так называемые заказчики просто отказывались подписывать с ними договор. Это говорит о том, что им был нужен не специалист вообще, а учеба конкретного Иванова или Сидорова, В итоге по целевой контрактной подготовке вузы республики недобрали 432 человека. Поэтому в данном "Положении..." неизбежны уточнения и изменения.

К сожалению, каждое абитуриентское лето не обходится без обид, разочарований, огорчений. И все же, если есть уверенность в своих знаниях и несправедливости поставленной оценки, резонно подавать апелляцию. Нередко экзаменаторы ошибаются, умышленно или неумышленно —это уже другой вопрос. Во всяком случае, в этом году из 640 апелляций более ста рассмотрены в пользу абитуриентов. Уж и не знаю, положительный это факт или отрицательный, но самые высокие показатели по удовлетворению апелляций — в Брестском университете и в БГУ: соответственно 52 и 38 процентов.

И вообще, в приемных и экзаменационных комиссиях работают не такие уж страшные люди, какими, наверное, рисует их воображение возбужденных абитуриентов. Например, в этом году был предпринят весьма гуманный шаг — с молодыми людьми, пострадавшими 30 мая на станции метро "Немига", Министерством образования и вузами проводилась индивидуальная работа и создавались щадящие условия для поступления.

При том, что живем мы довольно бедно, все больше молодых белорусов получают свое образование за деньги. В этом году на платные отделения государственных вузов зачислено более 22 тысяч человек. Из них на дневное обучение — около 12 тысяч, что почти на 700 человек больше, чем в прошлом году. Ставки платы за учебу весьма неравнозначны: в зависимости от материально-технической базы вуза, его кадрового уровня, а также специальности — примерно от двухсот до трех тысяч долларов в год. Недешево. Поэтому Министерство образования пытается "протолкнуть" вопрос о выдаче кредитов на образование. Было бы неплохо.

С каждым годом растет популярность белорусских вузов среди россиян. Два года назад попытали счастья у нас 484 молодых гражданина союзного государства, и 123 из них стали " белорусскими" студентами. А в этом году поток заметно вырос: поступали 1003 российских абитуриента, и 358 из них прошли по конкурсу. С одной стороны, братьям-славянам мы всегда рады, но все же не грех было бы заодно продумать и сопутствующие "образовательной" дружбе проблемы, в частности, обязательное распределение, которое сейчас для "белорусских" студентов из России вовсе и не обязательно.

Вот таковы вкратце уроки последней абитуриентской кампании. На коллегии Министерства образования итоги этой работы подведены, проблемы обсуждены, задачи поставлены. В этом году к доработке "Правил приема..." решили "приложить руку" соответствующие службы Администрации Президента Республики Беларусь. Распоряжение подписано, комиссия создана, процесс пошел. В добрый путь.

**Светлана КОВАЛЕВСКАЯ,**
**(газета "Рэспубліка").**

